творчую зону самай актыўнай падтрымкі аўтэнтычнай традыцыі на дзяржаўна-прававым узроўні. Фальклорна-этнаграфічныя гурты аўтэнтычнай арыентацыі павінны стаць нацыянальным эталонам духоўнасці, які не дасць канчаткова дэградзіраваць нацыі ў сітуацыі татальнай агрэсіі кітчавага мастацтва, «замбіраванне» якім актыўна вядзецца праз сродкі масавай інфармацыі.

Актуальнасць захавання нашай народнай спадчыны ўзрастае з кожным днём, яна патрабуе шчырага бацькоўскага клопату, дакладных праграм нашай дзейнасці на блізкую і аддаленую перспектывы.

Відаць, наспела пільная патрэба ў любым культуралагічным курсе ў ВНУ. Трэба хаця б у якасці паралелі або гістарычнага фону знаёміць студэнтаў з нашымі рытуальна-абрадавымі комплексамі, з іх глыбінным сэнсам, з сутнасцю сімволікі народнай культуры, са светапоглядпай сістэмай народнай педагогікі, цесна пераплятаючы не толькі фальклорную культуру, але і народнае дойлідства, дэкаратыўна -прыкладное мастацтва і інш. Нашы нашчадкі шчыра аддзячаць нам за гэты пачэсны клопат. Трэба, каб кожная лекцыя, кожны семінар сталі жывым помнікам нашаму багатаму шчырасцю душы народу, свайму роду, сваёй сям'і, кожнаму з нас.

**Смолік А.І.**, *дацэнт*

## ГІСТАРЫЧНАЯ АДУКАЦЫЯ — САСТАЎНАЯ ЧАСТКА САЦЫЯЛЬНА-ГУМАНІТАРНАЙ ПАДРЫХТОЎКІ СТУДЭНТАЎ

З пачатку 90-х гадоў у ВНУ рэспублікі пачалі ўкараняцца новыя вучэбныя дысцыпліны, якія ўжо даўно вывучаюцца ў



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

навучальных установах заходніх краін. У іх ліку сацыялогія, паліталогія, макра- і мікраэканоміка і інш. Адначасова ажыццяўляліся змены ў змесце філасофскіх і гістарычных дысцыплін на аснове новай нацыянальна-дзяржаўнай канцэпцыі гуманітарнай адукацыі. На стан гістарычнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь рашаючы ўплыў аказалі два асноўныя фактары: па-першае, набыццё дзяржаўнага суверэнітэту і, па-другое, дэмакратызацыя ўсяго грамадска-палітычнага жыцця. Усё гэта вымагала вызначэння новага зместу гістарычнай адукацыі, даследавання прадметна-канцэптуальных асноў гістарычных дысцыплін.

Вучоныя і педагогі універсітэта пачалі пошук і распрацоўку стратэгіі гістарычнай адукацыі. У аснову яе была пакладзена ідэя нацыянальнага адраджэння. Стратэгія, якой прытрымліваюцца навукова-педагагічныя кадры Беларускага універсітэта культуры, прадугледжвае вызваленне гістарычнай адукацыі ад аднабаковых ідэалагічных установак і метадалагічных догмаў. Яна абапіраецца на прынцыпы дэмакратыі, гуманітарызму, агульначалавечных каштоўнасцей, плюралізм думак і метадалагічных падыходаў.

У адпаведнасці з распрацаванай канцэпцыяй гістарычнай адукацыі ў вучэбныя планы ўсіх спецыяльнасцей і спецыялізацый уведзены гістарычныя дысцыпліны, павялічана колькасць гадзін на вывучэнне гісторыі Беларусі і найноўшай гісторыі замежных краін.

На наш погляд, выкладчыкі універсітэта знайшлі аптымальны варыянт паслядоўнасці выкладання гістарычных дысцыплін. Так, гісторыя Беларусі і сусветная гісторыя вывучаюцца студэнтамі на I і II курсах. Вызначаны і формы кантролю якасці гістарычных ведаў. На першым курсе студэнты здаюць залік, а пасля заканчэння ўсяго гістарычнага курса прадугледжаны выніковы экзамен.

Складанай задачай педагогаў з'яўляецца забеспячэнне пераемнасці гістарычнай адукацыі. Навукоўцамі былі прааналізаваны тры ўзроўні выкладання гісторыі ў рэспубліцы і складзена праграма, якая арыентуе студэнтаў на вывучэнне і асэнсоўванне заканамернасцей і прычынна-выніковых сувязей гістарычнага працэсу, агульнага і асаблівага ў гісторыі розных краін. Каштоўнасцю праграмы, якую распрацавала кафедра гісторыі Беларусі і замежных краін Беларускага універсітэта культуры, з'яўляецца тое, што ў ёй акцэнт робіцца на вывучэнне айчыннай гісторыі з нацыянальна-дзяржаўных пазіцый. Праграма прадугледжвае азнаямленне з асноўнымі гістарыяграфічнымі канцэпцыямі, якія існуюць па асобных праблемах і перыядах айчыннай гісторыі.

Перад гісторыкамі вышэйшай школы паўстала праблема падрыхтоўкі новых варыянтаў падручнікаў і дапаможнікаў па сусветнай і айчыннай гісторыі. На сённяшні дзень новае пакаленне вучэбнай і метадычнай літаратуры распрацавана толькі для агульнаадукацыйнай школы. Маюцца на ўвазе школьныя падручнікі «Мая Радзіма — Беларусь» (аўтары В.Белая, А.Жытко, У.Пляшэвіч, А.Траяноўскі), «Гісторыя Беларусі ў сярэднія вякі» (аўтары Г.Штыхаў і В.Ракуць). Выйшлі з друку дапаможнікі для старшых класаў: «Сусветная гісторыя» (ч.2, аўтары Г.Космач, П.Лук'янаў, У.Тугай) і «Гісторыя Беларусі» (кн.1; пад рэдакцыяй Я.Новікава і В.Цяпловай). Але студэнты універсітэтаў і інстытутаў вымушаны карыстацца падручнікамі і дапаможнікамі, якія не адпавядаюць зместу вучэбных праграм, новай канцэпцыі гістарычнай адукацыі. У нейкай меры вырашэнню гэтай праблемы садзейнічае вучэбны дапаможнік «Метадалогія гісторыі» (на рускай мове; пад рэдакцыяй А.Алпеева, У.Сідарцова, Р.Кушнера). Яго могуць выкарыстоўваць гісторыкі пры выкладанні метадалогіі гісторыі, гістарычнай геаграфіі, псіхагісторыі. Станоўчую ацэнку на пасяджэнні Дзяржаўнай камісіі атрымаў дапаможнік

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

«Гісторыя Беларусі ад старажытных часоў да 1995г.» (аўтары Г.Марцуль і інш.).

Думаецца, з выхадам гэтага дапаможніка студэнты ВНУ будуць мець магчымасць пазнаёміцца з непаўторным гістарычным шляхам беларускага народа, з яго самабытнай матэрыяльнай і духоўнай культурай.

Значную ролю ў вывучэнні гісторыі на цяперашнім этапе адыгрываюць вучэбна-метадычныя матэрыялы, курсы лекцый, якія распрацоўваюцца навукоўцамі ў ВНУ. Пры складанні названых матэрыялаў неабходна ўлічваць дасягненні сучаснай айчыннай і замежнай гістарычнай навукі. Важна асвятляць у лекцыях і на семінарах «белыя плямы» ў гісторыі беларускага народа, не абыходзіць негатыўныя працэсы і тэндэнцыі, якія мелі месца ў мінулым. Вартасцю лекцый павінна быць асвятленне розных канцэптуальна-тэарэтычных падыходаў да гістарычнага працэсу.

Гісторыкам творчых ВНУ асабліва важна акцэнтаваць увагу на вывучэнні гісторыі культуры. Менавіта ў сферы культуры ў канцэнтраванай форме праяўляюцца ўсе бакі жыцця і дзейнасці чалавека, сацыяльна-эканамічнага і дзяржаўнага ладу краіны. У сувязі з гэтым педагогі універсітэта акцэнтавалі ўвагу на азнаямленні студэнтаў з укладам беларускай культуры ў скарбніцу сусветнайкультуры. У лекцыях неабходна раскрываць асаблівасці гістарычных умоў і пераемнасць у развіцці культуры. На семінарах неабходна глыбока вывучаць творчасць вядомых дзеячаў культуры, асноўныя дасягненні ў развіцці адукацыі, навукі і мастацкай творчасці, іх узаемасувязь з сацыяльна-эканамічным і палітычным жыццём. Разам з пытаннямі культуры трэба вывучаць і пытанні рэлігіі як адной з форм грамадскай свядомасці і асноў цывілізацыі.

Педагогі універсітэта істотна перагледзелі падыходы да вывучэння гісторыі культуры і рэлігіі і стварылі камп'ютэрныя

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

праграмы па азначанай праблеме. Разам з кафедрай інфармацыйных тэхналогій у культуры і мастацтве створаны навучальныя праграмы па тэмах «Культура Беларусі ў XIV-XVI стст.» і «Этнаканфесіянальная структура ў Вялікім княстве Літоўскім (XIV-XVI стст.)».

Асновай праграм з'яўляецца комплекс Belarus, які адносіцца да камп'ютэрных сродкаў навучання па гісторыі. У ім прадугледжаны рэжым навучання і рэжым уводу вучэбна-метадычнага матэрыялу ў выглядзе схем, інфармацыйна-даведачных тэкстаў, рознага роду тлумачальнай інфармацыі. Вартасцю праграм з'яўляецца тое, што яны разлічаны не на рэпрадуктыўны ўзровень, а на асацыятыўнае мысленне, здольнасць лагічна аб'ядноўваць гістарычныя падзеі.

Камп'ютэрная праграма па першай тэме ўтрымлівае багаты інфармацыйна-даведачны матэрыял аб мысліцелях і асветніках Беларусі перыяду Рэфармацыі. З дапамогай камп'ютэра студэнты і выкладчыкі могуць прасачыць за працэсам фарміравання багатай гуманістычнай культуры на Беларусі. Значная частка праграмы прысвечана аналізу філасофска-этычных поглядаў Францыска Скарыны, Сымона Буднага, Міхаіла Літвіна, Яна Намыслоўскага, Саламона Рысінскага і іншых беларускіх гуманістаў.

Камп'ютэрная тэхналогія дае студэнтам магчымасць адчуць велізарнае ўздзеянне рэфармацыйнага руху на культурнае жыццё Беларусі. Базы даных аб беларускіх пісьменніках і паэтах эпохі Адраджэння раскрываюць гістарычную ролю літаратуры ў станаўленні прагрэсіўнай рэнесанснай культуры.

У праграме багаты інфармацыйна-даведачны тэкст аб фарміраванні рэгіянальнай своеасаблівай мастацкай культуры. Знаёмства з дойлідствам, жывапісам, скульптурай і дэкаратыўна-прыкладным мастацтвам эпохі Адраджэння падводзіць студэнтаў да разумення арганічнага спалучэння і творчай перапрацоўкі заходнееўрапейскіх і традыцыйна-народных вытокаў у беларускай культуры.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Выкладчыкам універсітэтаў варта звярнуць увагу на стварэнне аналагічнай праграмы, якая б знаёміла студэнтаў з культурай працы, побыту, адзення, жылля і паселішч.

У пералічаных падручніках і дапаможніках вельмі спрошчана разглядаецца рэлігійнае пытанне на Беларусі, роля царквы ў грамадска-палітычным жыцці. Вядома, што ў XVI-XVII стст. рэлігійны рух быў моцны і глыбока парушыў усё грамадства. Новыя накірункі рэлігійнай думкі прымушалі людзей лепш углядацца ў палітычнае і культурнае жыццё, звяртацца да навукі і асветы, што спрыяла абуджэнню нацыянальнай свядомасці.

Улічваючы тое, што ў грамадскім жыцці беларусаў рэлігія займала пазіцыю гаранта стабільнасці, парадку, непарушальнасці духоўных асноў грамадства, нацыянальных традыцый этнасу, выкладчыкамі кафедры гісторыі універсітэта на базе камп'ютэрнага комплексу створана праграма «Этнаканфесіянальная структура ў Вялікім княстве Літоўскім (XIV-XVI стст.)». У ёй змешчаны структурна-лагічныя схемы і базы даных аб асноўных канфесіях, царкоўнай іерархіі, этнаканфесіянальных групах на Беларусі. Матэрыялы праграмы знаёмяць студэнтаў з супярэчлівым рэлігійным жыццём. Значная ўвага надаецца характарыстыцы праваслаўя, якое было самай распаўсюджанай рэлігіяй на беларускіх землях. Праграма дазваляе прасачыць за працэсам узвышэння каталіцкай царквы, роля якой асабліва ўзрасла ў канцы XVI — пачатку XVII ст.

Вартасцю праграмы з'яўляецца тое, што ў ёй ёсць матэрыял аб асноўных рэлігійных плынях унутры хрысціянства. Частка праграмы прысвечана аналізу пратэстантызму, кальвінізму і антытрынітарызму.

Праграма дае ўяўленне аб рэлігійна-нацыянальных арганізацыях, якія адыгрывалі вялікую ролю ў развіцці пэўных сфер культуры, літаратуры, пісьменства, дэмакратызацыі школьнай сістэмы і адукацыі.

Для насельніцтва Беларусі была характэрнай гістарычная традыцыя талерантнасці. У XIV-XVI стст., калі Еўропу ахапілі рэлігійныя войны, на тэрыторыі нашай краіны мірна існавалі прадстаўнікі розных веравызнанняў. Таму выкладчыкі універсітэта шырока знаёмяць студэнтаў з асаблівасцямі і сутнасцю рэлігійных вучэнняў этнаканфесіянальных груп і супольнасцей.

Пры выкладанні гісторыі Беларусі педагогі павінны засяродзіць увагу студэнтаў на праблеме беларускай дзяржаўнасці ў сярэднявеччы. Добрым дадаткам да лекцыйнага матэрыялу з'яўляецца камп'ютэрная праграма «Утварэнне і лад старажытных княстваў». Нягледзячы на шматлікія навуковыя працы па гісторыі Беларусі, якія з'явіліся ў апошнія гады, гісторыя раннефеадальных княстваў слаба ўяўляецца студэнтамі. Яны дапускаюць шмат недакладнасцей, схематызму, блытаніны па пытаннях узнікнення княстваў, палітычных і эканамічных адносін з Кіеўскай, Наўгародскай і Смаленскай землямі. Структурныя схемы праграмы складзены так, каб студэнты больш яскрава ўяўлялі палітычную гісторыю Старажытнай Беларусі. У камп'ютэрным комплексу сабраны базы даных па 11-ці княствах, якія існавалі на тэрыторыі нашай краіны ў X-XII стст. Упершыню ў абагульненай форме даецца цэласны матэрыял аб генеалогіі полацкіх князёў, маюцца даныя аб іх паходжанні, аб перыядах, калі яны трымалі ўладу ў сваіх руках.

Вельмі важна падвесці студэнтаў да разумення, што ўтварэнне старажытных раннефеадальных дзяржаў было важнейшай умовай фарміравання беларускай дзяржаўнасці. Праз усю праграму праходзіць ідэя, што дасягнуты ўзровень сацыяльнага і палітычнага развіцця княстваў стаў падмуркам дзяржаваўтваральных працэсаў у беларускіх землях на працягу ўсяго перыяду сярэднявечча.

Вопыт выкладання гісторыі сведчыць, што вельмі складанымі для студэнтаў з'яўляюцца пытанні стварэння і развіцця Вялікага княства Літоўскага.

Палітычны і сацыяльны лад ВКЛ прайшоў шматвяковую эвалюцыю, аб'яднаў рысы іншаземных сістэм кіравання і тыя,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

якія склаліся яшчэ ў часы Полацкага княства. Таму ў Беларускім універсітэце культуры гісторыкамі распрацаваны дзве камп'ютэрныя праграмы: «Сістэма кіравання ў Вялікім княстве Літоўскім (XIV-XVI стст.)» і «Сацыяльны лад у ВКЛ у XIV-XVI стст.».

На семінарскіх занятках у камп'ютэрным класе або самастойна, з дапамогай асабістага камп'ютэра, студэнт мае магчымасць пазнаёміцца са структурай дзяржаўнай улады, дэмакратычнай сістэмай кіравання. Аўтары праграмы імкнуліся вырашыць і такую задачу, як прасачыць працэс утварэння грамадзянскіх груп-класаў пад уплывам эканамічна-палітычнага развіцця Беларуска-Літоўскай дзяржавы. Базы даных і структурна-лагічныя схемы праграмы дазваляюць глыбока пазнаёміцца са становішчам у грамадстве феадалаў-землеўласнікаў, з іх прывілеямі і абавязкамі. У праграме ёсць багаты матэрыял аб другім класе феадальнага грамадства — сялянах. З яе дапамогай студэнты яскрава могуць уявіць, з якіх слаёў складалася земляробчае насельніцтва Беларусі, высветліць умовы карыстання зямлёй. Сутнасць феадальнай эксплуатацыі сялян вынікае з той часткі праграмы, якая прысвечана аналізу падаткаў і павіннасцей, выконваемых сялянамі.

Праграмны комплекс BELARUS як камп'ютэрны сродак навучання ў галіне гуманітарных дысцыплін прадугледжвае стварэнне камп'ютэрных матэрыялаў па іншых тэмах курса. Сучасныя камп'ютэры дазваляюць уключаць у праграмы графічныя матэрыялы, схемы і карты. Гэта дае магчымасць увесці шэраг наглядных дапаможных матэрыялаў і ўзбагаціць структурна-лагічныя схемы.

Такім чынам, педагогамі Беларускага універсітэта культуры зроблены значны крок па распрацоўцы і адаптацыі да гістарычнай навукі сучасных камп'ютэрных праграм. Наступным крокам павінна быць падрыхтоўка вучэбна-метадычнай літаратуры па праблеме ўкаранення ў навучальны працэс камп'ютэрнай тэхналогіі.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ